Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Аркадзь Куляшоў:
# час чытаць, захапляцца і спрачацца

Метадычныя матэрыялы па прапагандзе творчасці
Аркадзя Куляшова да 110-годдзя з дня нараджэння

г. Кобрын
2024

Складальнік
Загадчык аддзела бібліятэчнагага маркетынгу
цэнтральнай раённай бібліятэкі
Т. А. Галавейка

Аркадзь Куляшоў: час чытаць, захапляцца і спрачацца : метадычныя матэрыялы да 110-годдзя з дня нараджэння А. Куляшова / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; складальнік Т. А. Галавейка. – Кобрын : цэнтральная раённая бібліятэка, 2023. – с. 38.

Метадычныя матэрыялы распрацаваны з мэтай аказання дапамогі ў папулярызацыі літаратуры аб жыцці і творчасці Аркаддзя Куляшова, адрасуюцца супрацоўнікам бібліятэк і ўсім, хто зацікаўлены творчасцю пісьменніка. Выданне ўключае тэарэтычны і практычны матэрыял.

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2024

**ЗМЕСТ**


1. УСТУП________________________________________С. 4 - 5
2. ДУМКІ І РАЗВАЖАННІ ПРА ТВОРЧАСЦЬ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА______________________________________С. 5 - 6
3. ПЕРАЛІК ТВОРАЎ А. КУЛЯШОВА_______________С. 8
4. ПРЫКЛАДНЫ ПЛАН КНІЖНАЙ ВЫСТАВЫ “ЁН СЭРЦАМ ПІСАЎ КОЖНЫ СВОЙ ВЕРШ”_____С. 9
5. СЦЭНАРЫЙ ЛІТАРАТУРНА – ПАЭТЫЧНАЙ ВЕЧАРЫНЫ “ЁСЦЬ У ПАЭТА СВОЙ АБЛОГ…”_______________ С. 9 - 14
6. СЦЭНАРЫЙ ЮБІЛЕЙНАЙ ВЕЧАРЫНЫ “УРОКІ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ А. КУЛЯШОВА”_____________________С. 15 - 21
7. СЦЭНАРЫЙ ЛІТАРАТУРНА –МУЗЫЧНАЙ КАМПАЗІЦЫІ “ІМГНЕННЯЎ ПАЭТЫЧНЫХ ХАРАСТВО”_________С. 22 - 25
8. ПАЗНАВАЛЬНАЯ ВІКТАРЫНА____________________С. 26 - 27
9. ДАДАТКОВЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ДА ВІКТАРЫН ПА ТВОРЧАСЦІ А. КУЛЯШОВА_______________________С. 28 - 36
10. КРЫНІЦЫ_____________________________________________С. 37

*Свет Куляшова увасаблялі дзве стыхіі – крынічныя берагі роднай Беларусі і неутаймаваная бязмежнасць “акіяна”.*

*Першая са стыхій стварала глыбока лірычны, апавядальны асяродак яго паэзіі, другая – шырока эпічную цягу да планетарных маштабаў, да філасофскага спасціжэння драматызму ўсечалавечага жыцця, да трывожнага засяроджанага роздуму аб свеце і сусвеце.*

*Мікола Арочка*



**Аркадзь Куляшоў (1914 - 1978)** - беларускі савецкі паэт, пераводчык. Народны паэт БССР (1968). Лаўрэат дзвух Сталінскіх прэмій (1946, 1949). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларускай ССР імя Янкі Купалы (1970). Лаўрэат Прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1968). Член ВКП(б) с 1941 года. Член Саюза пісьменнікаў СССР (1934).

У 2024 годзе спаўняецца 110 гадоў з дня нараджэння Аркадзя Куляшова. Гэта значная падзея ў маштабах усёй краіны. Лірык і філосаф, які з незвычайнай шчырасцю і цеплынёй выказаў у сваёй творчасці лёс цэлага пакалення, да якога належаў і сам. Аркадзь Куляшоў - паэт - інтэрнацыяналіст, пісьменнік, які з першага дня сваёй творчай працы, заявіў пра сябе як мастак, здольны пачуць увесь свет. Многія вершы, створаныя ў няпростых умовах, сталі класікай айчыннай грамадзянскай лірыкі. Ступень адкрытасці перад чытачом, ступень суперажывання сучасніку ён узвёў на небывалыя вышыні .

Вялікі нямецкі паэт Ёган Вольфганг Гётэ сказаў: «Той , хто хоча зразумець паэта, павінен прыйсці ў яго край». Каб зразумець сілу і велічыню таленту Аркадзя Куляшова, трэба пабываць на яго радзіме - на Касцюкоўшчыне. Тут пусціла карані дрэва яго творчасці, тут пачынаецца радавод яго паэзіі . Амаль кожны год ён прыязджаў у родную вёску - край дзяцінства, маладосці, надзей. Невялікая, але дарагая сэрцу паэта рака Бесядзь, прайшла праз усё яго жыццё і творчасць.

За шматгадовую літаратурную і грамадзянскую дзейнасць А. Куляшоў быў узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У 1968 паэту прысвоена ганаровае званне «Народны паэт Беларусі». А. Куляшоў выступаў як перакладчык, пісаў сцэнарыі фільмаў. Аўтар літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў. Яго творы

перакладзены на многія мовы свету. Вершы Куляшова пакладзены на музыку. Імя А. Куляшова носіць Магілёўскі Дзяржаўны універсітэт, школа ў Мінску. Яго імем названы многія вуліцы ў гарадах Беларусі. У 1979 г. Саюзам пісьменнікаў Беларусі была заснавана Літаратурная прэмія імя А.Куляшова, якая прысуджаецца беларускім паэтам. Пра жыццё і творчасць Куляшова зняты дакументальны фільм «Край крынічны».

Творчасць Аркадзя Аляксандравіча Куляшова – адна з найбольш яркіх старонак у гісторыі беларускай паэзіі. Выдатны майстар слова, мастак высокай культуры, ён у сваёй творчасці выявіў лёс цэлага пакалення, да якога належыў і сам. Аркадзь Куляшоў не ўсведамляў сябе па-за агульназначнымі праблемамі чалавечага быцця, раскрываў агульначалавечае праз глыбока асабістае ўспрыманне рэчаіснасці і свету наогул. Ён узбагаціў традыцыі беларускага верша, пашырыў яго вобразна-выяўленчыя і стылёвыя магчымасці.

Паэт надаў высокі філасофскі ўзровень беларускай паэзіі. Паэзія Аркадзя Куляшова ўвайшла ў залаты фонд беларускай літаратуры ХХ стагоддзя. Творчасць яго склала цэлую эпоху ў беларускай літаратуры. Амаль пяцьдзесят год свайго жыцця аддаў ёй паэт.

## ДУМКІ І РАЗВАЖАННІ ПРА ТВОРЧАСЦЬ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

Шлях у літаратуру ў Аркадзя Куляшова быў не надта складаным, але вельмі цікавым і плённым. Першыя вершы ён напісаў у шасцігадовым узросце на рускай мове. У шостым класе вучань Саматэвіцкай сямігадовай школы пабачыў свой верш “Ты мой брат” на старонках Клімавіцкай акруговай газеты “Наш працаўнік”. Далей творы Куляшова пабачылі свет на старонках часопісаў “Маладняк”, “Полымя”, “Чырвоны сейбіт”.

Калі меркаваць па тых літаратурных здабытках, што з’явіліся ў друку ў розныя часы, то можна ўпэўнена сказаць, што творчасць Аркадзя Куляшова мае некалькі выразных этапаў. Разважанне пра творчасць пэўнага літаратара павінна быць звязана з аналізам той канкрэтна гістарычнай сітуацыі, што абварункоўвала яго погляды на жыццё і навакольны свет.

У дваццатыя-трыццатыя гады Куляшоў інтэнсіўна фарміруецца і развіваецца як паэт. Заўважаецца пэўная засяроджанасць на сваім уласным унутраным свеце, які паэт прыстасоўвае да сучасных сацыяльных умоў, будуе ўласную паэтычную культуру, засвойваючы здабыткі класікаў беларускай і рускай літаратур.

Зборнік вершаў "Медзі дождж" і паэма "Аманал" завяршылі першы этап фарміравання творчых здольнасцяў паэта. Куляшоў ішоў сваім арыгінальным шляхам, ствараючы сваю манеру і свае падыходы ў рэалізацыі творчых задум. Невычарпальную крыніцу сваёй творчасці Куляшоў знайшоў у народнай творчасці, а таксама ў класікаў – Я.Коласа, Я.Купалы, А.Пушкіна, М.Някрасава.

Лічыцца, што канец трыццатых гадоў з'яўляўся сапраўдным уздымам творчасці паэта. Паэтычны цыкл "Юнацкі свет" і шэраг іншых вершаў сведчаць пра тое, што фарміраванне творчай асаблівасці Куляшова паспяхова завяршылася.

З пункту гледжання сучаснага чалавека, можна сказаць, што ў гады культу асобы паэт захапіўся ўзнёслымі ўсхваленнямі таталітарнай камуністычнай улады і яе лідэраў, аднак у хуткім часе расчараваўся і адарваўся ад матываў ідэалагічнай прапаганды.

Творы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне раскрылі ў Куляшове шматгранны талент чалавека, які здольны супяражываць з народам трагедыю фашысцкай навалы. У пасляваенны час літаратура падпарадкоўваецца тагачасным плыням, але і тады паэзія Куляшова выдзяляецца сваім глыбокім інтэлектуалізмам, палкім грамадзянскім пафасам.

Куляшоў быў наватарам не толькі ў адкрыцці новых метадаў і тэм у беларускай літаратуры, але і ў першынстве выяўлення адчуванняў чалавека пасля вяртання з космасу. Беларускі касманаўт Пётр Клімук вельмі здзівіўся, калі прачытаў вершы Куляшова, адзначыўшы, што з такой дакладнасцю нават ён, пабываўшы на каляземнай арбіце, не змог перадаць свае адчуванні, а таленавіты паэт, карыстаючыся сваім светаўспрыманнем, здолеў трапна і вобразна перадаць пачуцці.

Падышоўшы да заходу свайго жыцця, Куляшоў звяртаецца да філасофскіх тэм: існаванне чалавека на зямлі, захаванне планеты, недапушчальнасць у парушэнні нормаў жыцця.

У сваіх творах ён выступае як сапраўдны сябар, які ніколі не здрадзіць сяброўству, Бацькаўшчыне, роднай жанчыне. Як казаў Уладзімір Караткевіч, Куляшову надта падыходзіць старадаўні беларускі пранцып, па якім жылі нашыя слаўныя продкі: "Людзям – душа, жыццё – свайму дому, сэрца – жанчыне, гонар – нікому ".

*Выкладчык кафедры беларускай мовы і методыкі яе выкладання БДПУ імя М.Танка*
*ЛАБАЧЭНЯ ГЕНАДЗЬ ЯКУБАВІЧ*

# ТВОРЫ А. КУЛЯШОВА

**Кнігі паэзіі**
«Росквіт зямлі» («Расцвет земли») (1930)
«Па песню, па сонца!..» («За песней, за солнцем!..») (1932)
«Медзі дождж» («Меди дождь») (1932)

**Зборнікі вершаў**
«Мы жывем на граніцы» («Мы живём на границе») (1938)
«Радзіме і правадыру» («Родине и вождю») (1938)
«У зялёнай дуброве» («В зелёной дубраве») (1940)
«Добры чалавек» («Добрый человек») (1941)
«Сцяг брыгады» («Знамя бригады») (1943)
«На сотай вярсце» («На сотой версте») (1945)
«Вершы» («Стихотворения») (1946)
«Паэмы» («Поэмы») (1947)
«Выбраныя вершы і паэмы» («Избранные стихотворения и поэмы») (1948)
«Камуністы» («Коммунисты») (1949)
«Выбраныя творы» («Избранные произведения») (1947, 1951)
«Вершы і паэмы» («Стихотворения и поэмы») (1954, 1966)
«Граніца» («Границы») (1954)
«Новая кніга» («Новая книга») (1964)
«Сасна і бяроза» («Сосна и берёза») (1970)
«Мая Беседзь» («Моя Беседь») (1973)
«Хуткасць» («Скорость») (1976)
«Крылы» («Крылья») (1985)
«Профілі» («Профили») (1987)
«Маналог» («Монолог») (1989)
«Збор твораў» у 2 т. («Собрание произведений» в 2 т.) (1957, 1964)
«Збор твораў» у 4 т. («Собрание произведений» в 4 т.) (1966—1967)
«Збор твораў» у 5 т. («Собрание произведений» в 5 т.) (1974—1977)
«Паміж наступным і былым» («Между следующим и бывшим») (1995)

**Паэмы**
«Крыўда» (1931)
«Аманал» («Аммонал») (1933)
«Гарбун» («Горбун») (1935)
«Баранаў Васіль» («Баранов Василий») (1941)
«Дом №24» («Дом № 24») (1944)
«Прыгоды цымбал» («Приключения цимбал») (1945)
«Простыя людзі» («Простые люди») (1949)
«Новае рэчышча» («Новое русло») (1949, 1951)
«Грозная пушча» («Грозная пуща») (1956, 1963)
«Далёка да акіяна» («Далеко до океана») (1972)
«Варшаўскі шлях» («Варшавский путь») (1973)
«Хамуціус» («Хамутиус») (1975)

З мэтай папулярызацыі творчасці паэта прапануем аформіць бібліятэчныя выставы і паліцы, адкрытыя прагляды літаратуры пад назвамі: **“Без чалавечнасці не будзе вечнасці”, “З крыніц маленства”, “Імгненняў паэтычных хараство”, “Ён сэрцам пісаў кожны свой верш”, “Ён наш паэт, ён наша слава”, “І вечнасць радка, як вечнасць жыцця”, “Мільёны лёсаў у адным”, “Паэзія – маё жыццё”, “Край беларускі… мне дарагі і блізкі”, “Урокі жыцця і творчасці А. Куляшова”, “Я на ўсё жыццё абраў дарогу”, “Карусель Аркадзя Куляшова”, “І кружыцца планета Куляшова…”.**

Прапануем вашай увазе прыкладны план кніжнай выставы

## “ЁН СЭРЦАМ ПІСАЎ КОЖНЫ СВОЙ ВЕРШ”

*Мне кожны год, нібы жыццём другім,*
*Жыць у дваццаты век наш давялося...*
*Я – акіяну жытняга калоссе:*
*Мільёны лёсаў змешчаны ў маім,*
*Яшчэ да дна не вычарпаным, лёсе.*

*А.Куляшоў*

1 раздзел. **Каб ведалі, хто ён такі** (Літаратура аб жыцці і творчасці А.Куляшова)

*Паўтарыў бы зноў, каб давялося,*
*Я жыццё сваё – за крокам крок.*

*А.Куляшоў*

2 раздзел. **Творчасцю трэба жыць штодня** (Творы А.Куляшова)

*Бывали дни и добрые и злые,*
*Но зло не лилось с твоего пера.*
*Чтоб ни было, во времена любые,*
*Была твоя поэзия добра.*

*Кайсым Кулиев “Лицо друга”*

3 раздзел. **Паэзія – у спасціжэнні паэзіі** (Крытычныя публікацыі з газет, часопісаў, інтэрнэт-рэсурсы)

*«Спадарожнічаючы нам з дзяцінства, са школьных год,*
*паэзія А. Куляшова нязменна актыўнасцю ідэйнага пошуку,*
*багаццем і дасканаласцю мастацкіх вобразаў,*
*саграваe сваёй непадробнай чалавечнасцю,наталяе прагу хараства»*

*У. Гніламёдаў*

# “ЁСЦЬ У ПАЭТА СВОЙ АБЛОГ…”

*Сцэнарый літаратурна – паэтычнай вечарыны*

*Да вершаў, прызначаных чытальнікам, рэкамендуем падабраць матэрыялы для мультымедыйных прэзентацый па зместу.*

*Вядучы 1.* Добры дзень, прыхільнікі беларускага слова і беларускай паэзіі.
*Вядучы 2.* Сёння мы пагаворым аб цудоўным самабытным паэце Аркадзе Куляшове.

*Гучыць урывак з песні І. Лучанка «Алеся».*

*Вядучы 1.* Мала хто не ведае сёння радкі гэтай песні, у аснову якой пакладзены верш «Бывай...», напісаны ў 1928 годзе чатырнаццацігадовым юнаком з далёкага кутка Беларусі. На час з'яўлення песні аўтар ужо быў сталым беларускім паэтам, у яго сотні вершаў і дзесяткі паэм. Аркадзь Куляшоў — яркі прадстаўнік беларускай паэзіі XX стагоддзя. Яго талент стаіць побач з талентамі Янкі Купалы і Якуба Коласа. І агонь яго таленту не згасае:

*...Мой маналог, як палымяны конь,*
*Пачуўшы подых бур, стрыжэ вушамі,*
*Спяшаецца, паразмаўляўшы з вамі,*
*Ад вечнага агню ў жыцця агонь.*

«Мой маналог, як палымяны конь...», 1964-1965 г.г.

*Вядучы 2.* Нарадзіўся Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў 6 лютага 1914 года на ўсходзе Магілёўшчыны ў мястэчку Саматэвічы Касцюковіцкага\раёна. Гадаваўся на берагах Віхры і Бесядзі. Зялёныя дубровы і ельнікі, родныя рэкі, высокае неба малой радзімы заўсёды жывуць у яго паэзіі:

*Ёсць на свеце роднае мястэчка,*
*Там штогод бываюць кірмашы;*
*Міма школы маленькая рэчка*
*Без мяне плыве ў цішы...*

«Карусель», 1939 г.

*Вядучы 1.* Яго бацькі, Кацярына Фамінічна Ратабыльская і Аляксандр Мікалаевіч Куляшоў, былі настаўнікамі, мелі немалую бібліятэку і адзіны ў мястэчку грамафон, па якім любілі слухаць рускую і італьянскую оперную класіку.

Хатняя атмасфера, у якой рос хлопчык, была ўзнёслай. Яе стваралі мастацкае слова і музыка. Бацькі паэта да ўсяго і самі добра спявалі. Праз усё жыццё Куляшоў пранёс любоў да паэзіі Лермантава і Пушкіна. Менавіта прыгажосць высокамастацкага слова абудзіла ў васьмігадовым беларускім хлапчуку пачуццё прыгожага і адкрыла яму яго ўласнае прызначэнне.

*Чытальнік 1.*

Я музу параўнаў бы з роднай маці,
Ды слоў для параўнання не стае.
Адна ёсць маці, што як сонца ў хаце.

Хто можа быць радней нам за яе?
Я б музу параўнаў са сцежкай першай,
Што песню абвяла вакол сяла,
Калі б мяне, з маёю песняй пешай,
Дарогам сцежка не передала.

Калі б дарогі гэту эстафету
З рук палявых не аддалі шляхам,
Шляхі — чыгунцы, а чыгунка — свету.
Якое музе параўнанне дам?

Яна не маці, не дарога ў свеце,
А доля, з вечнай прагаю ў вачах.
Сцяжынкі ўслед за ёй бягуць, як дзеці.
Насустрач ёй ляціць за шляхам шлях.

*Вядучы 2.* Прыгадаем такі выпадак з дзяцінства паэта: ва ўзросце чатырох гадоў Аркадзь Куляшоў, імкнуўшыся паквітацца з дарослымі за крыўду, падпаліў хату крыўдзіцеля. Той жудасны пажар восені васемнаццатага года выпаліў палову мястэчка. Пазней усведамленне бяды, што ён прынёс землякам, абудзіла самасвядомасць будучага паэта.

«Так детство кончилось. Он прежним больше не был»,— скажа Куляшоў, пераносячы свой псіхалагічны вопыт на шасцігадовага хлапчука — героя верша «На Минском шоссе» (1941), які імгненна пасталеў пад бомбамі і агнём кулямётаў.

*Чытальнік 2.*
Я пакідаў маленства край,
Дзе жыў жыццём вясёлым,
Прыйшла і мне чарга бывай
Сказаць лясам і долам.

Глядзелі зоры на мяне
Здалёк, як на другога,
Нібы за жорава мяне
Лічылі маладога.

Глядзелі з вокнаў аганькі
Мне ўслед з трывогай шчырай,
Нібы ўдалёкі і цяжкі
Я падымаўся вырай.

Зямля шаптала мне — ляці,
Спяшайся, жораў ранні,
Цябе чакаюць у жыцці
Усе выпрабаванні...
«Крылы», 1945

*Вядучы 1.* Друкавацца Куляшоў пачаў з дванаццаці гадоў. Датай нараджэння паэта ў роднай літаратуры трэба лічыць 1926-ы. Менавіта ў гэты год на старонках Клімавіцкай акруговай газеты «Наш працаўнік» быў надрукаваны першы верш Куляшова «Ты, мой брат», а ў 1930 годзе ва ўзросце шаснаццаці гадоў ён выдаў свой першы зборнік вершаў «Росквіт зямлі».

Пасля заканчэння школы была вучоба ў Беларускім вышэйшым педагагічным інстытуце і плённая паэтычная праца. Адзін за адным выйшлі ў свет новыя зборнікі вершаў і паэм, якія расказвалі чытачам пра добра знаёмае кожнаму. Этапным творам прадваеннага перыяду стала паэма «У зялёнай дуброве». У ёй, а таксама і ў іншых творах канца трыццатых гадоў гучыць прадчуванне набліжэння вайны. Асобным трывожным настроем вылучаецца верш «Ранак».

*Чытальнік 1.*

Выходжу я ў разведку –
Рашучы заўтра бой.
Ты, ранак,
Будзь за сведку,
Услед ідзі за мной.
З табой у згодзе поўнай
Жылі мы з першых дзён.
У барацьбе няроўнай
Я трапіў у палон.
І рукі мне звязалі,
І ў плечы б'е прыклад.
«Вядзі! –
Мне загадалі, —
Паказвай шлях назад...»

«Ранак», 1940

*Вядучы 2.* У 1940 годзе Куляшоў складае паэму «Хлопцы апошняй вайны». Пазней паэт Аляксей Русецкі, сустрэўшы яго на прывакзальнай плошчы ў горадзе Калініне, калі той накіроўваўся да месца службы ў 11-ю армію Калінінскага фронту, скажа: «Вось дзе мы апынуліся, хлопцы апошняй вайны».

Там, у арміі, батальённы камісар І. В. Зуеў, даведаўшыся, што Куляшоў - паэт, прысвоіць яму званне малодшага палітрука і накіруе ў газету «Знамя Советов». Працуючы ваенным карэспандэнтам, Аркадзь Куляшоў напісаў там усе свае вершы і балады ваеннай пары, такія як «Балада аб чатырох заложніках», «Над брацкай магілай», «Ліст з палону», «Маці», «Пад восеньскім небам», «Бярозка» і іншыя. Гэтыя вершы выклікалі выбуховы эфект сярод чытачоў-беларусаў, бо яны вылучаліся незвычайнай эмацыянальнасцю.

*Чытальнік 2.*

Стаіць яна ў зрэбнай кашулі

Адна на пагосце.
Варожыя кулі
Пакінулі след на бяросце.
Стралялі чужынцы, ды цудам бярозка ўцалела.
Стаіць яна, нібы дзяўчына на месцы растрэла.
Не плач жа, бярозка, не лі свае слёзы,
Красуня,
Над люстрам ракі запляці свае косы,
Красуня.
Цябе не застрэлілі і не пагналі ў няволю.
Расці ж ты на радасць і рэчцы, і людзям, і полю!
«Бярозка», 1944

*Вядучы 1.* Вяршыняй ваеннай творчасці Куляшова з'явілася паэма «Сцяг брыгады». Паэма «Пра Беларусь і вайну», па словах аўтара, пісалася насуперак умовам жыцця: па начах у штабной зямлянцы, дзе астатнія ваенкоры, рускія журналісты, глядзелі на яго працу над беларускай паэмай як на занятак, які адцягвае сілы аўтара ад галоўнага.

Паэма, за якую ў 1946 годзе Куляшоў атрымаў Дзяржаўную прэмію 1- й ступені, была і застаецца найлепшым паэтычным творам беларускай літаратуры, прысвечаным падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

*Вядучы 2.* Ад празрыстых, бясхітрасных, але далёка не прымітыўных ранніх вершаў да сапраўдных паэтычных шэдэўраў — такі шлях творчай дзейнасці Куляшова. У ягоных творах крытыкі знаходзяць сляды ўплыву Купалы і Лермантава, і яго вялікага сябра — Аляксандра Твардоўскага. Але Аркадзь Куляшоў заўсёды быў і застанецца паэтам самабытным, нечаканым і глыбока народным. Жыццё беларускага народа, народная мудрасць — невычэрпная крыніца яго паэзіі.

*Я хаце абавязаны прапіскаю –*
*Калыскаю, падвешанай пад столь.*
*Я маці абавязан кожнай рыскаю,*
*Драўлянай лыжкаю, глінянай міскаю –*
*Усім, чым працы абавязан стол.*
«Я хаце абавязаны прапіскаю...», 1963

*Вядучы 1.* Аркадзь Куляшоў быў першаадкрывальнікам у паэзіі. Гэта добра відаць па філасофскай лірыцы «Новай кнігі», вершах і перакладах розных гадоў, паэмах «Далёка да акіяна», «Варшаўскі шлях» і «Хамуціус». Гэтыя вяршыні — вехі творчага шляху паэта.

Так, напрыклад, зборнік вершаў «Новая кніга», які ўбачыў свет у 1964 годзе, з-за нечаканай навізны светаадчування аўтара быў многімі крытыкамі прыняты не адразу. У той час не ўсе яшчэ асэнсавалі пачатак новай касмічнай эры ў развіцці чалавецтва. Толькі не Аркадзь Куляшоў.

*Чытальнік 1.*

Парушыўшы законы прыцягнення,
Планетамі сярод другіх планет
Існуем мы з табой як выключэнне,
Мая любоў, — як свет і антысвет.

Ніколі мы адной не ходзім сцежкай,
Не дзелім хлеб і дзелім толькі соль,
Ты сустракаеш смутак мой усмешкай
І смуцішся, калі міне мой боль.

Адказваеш на мой сардэчны захад
Нязгодаю, самай крыўднаю з нязгод.
Здаецца, павярніся я на захад,
Як тут жа ты павернешся на ўсход.

Аднак зямля б мая асірацела
І ўвесь сусвет ахутала б імгла,
Каб выбухнуўшы раптам, адляцела
Ты ў невядомасць з хуткасцю святла.
«Парушыўшы законы прыцягнення...», 1962

*Вядучы 2.* У 1973 годзе, на схіле жыцця, прадчуваючы, мабыць, свой скрушны лёс і ўжо не спадзяючыся на большае ў творчасці, Аркадзь Куляшоў напісаў цыкл вершаў, сярод якіх«Зайздрошчу я мастам…”

Зайздрошчу я мастам, не іх канструктарам,
Дарогам, па якіх да нашых дзён
Імчаць саставы з посвістам і грукатам,
Не помнячы праслаўленых імён.

Хачу, каб так і слова — не жалезнае,
Знаёмае з пакутай і слязьмі, —
Ад славы і імёнаў незалежнае,
Трымала сувязь з часам і людзьмі.

Хачу, каб слёзы, што ў душы радзіліся,
Жыццём сваім асобным зажылі,
Каб так, як дождж па шкле, яны каціліся
І па шчацэ, і па шляхах зямлі.

Хачу, каб не прылізаным і чысценькім
Быў сэрца боль, каб пёк ён і смылеў,
Каб не прыкрыт быў грэх прыстойным лісцікам,
Смех — гулкім рэхам быў, абвалам — гнеў.

А аўтар хто?Дзе рос? Як прызываецца?
Ёсць весткі альбо там яны ляжаць,
Дзе ўжо нічога ўслых не вымаўляецца? –
Знаць важна, але можна і не знаць.

Вы мне даруйце сёння, суддзі строгія,
Што мой і смех і гнеў не быў такім
І што, на жаль, пад імі, як і многія,
Я прозвішчам падпісваўся сваім.
«Зайздрошчу я мастам...», 1973

*Вядучы 1.* 2024 год для Аркадзя Куляшова юбілейны. На жаль, ён даўно не з намі. Мы ж па-ранейшаму застаемся з ім. Тыя, хто наталяе прагу сваёй душы з крыніц паэзіі. І хоць куляшоўская паэзія стала ўжо класікай, яна — не толькі гісторыя нашай літаратуры. На здзіўленне, вялікай сваёй часткай творчасць Куляшова сугучна нашаму часу, бо як мысліцель ён абганяў свой час. Таму і сёння яго паэтычнае слова ўдзельнічае ў справах жывых вопытам жыцця аўтара.

*Вядучы 2.* Сёння ж, калі мы зноў жывем надзеяй, хай часцей гучаць для нас радкі, падобныя звароту да нас, нашчадкаў, тых, хто ідзе на змену:

Я знаю, ты мой шлях, пераживеш
Мяне, мой верш.
Дык знай, калі рубеж
Ты не мінеш, які завуць вайною,
Апошняй бітваю дабра са злом,
З тым злом, што мы пад Брэстам і Масквою
У сорак першым нішчылі з табою, —
Знай: дзень, што судным выбухне агнём,
Той дзень і нашым будзе судным днём,
Тады мяне ты ўспомні, як салдата...
«Варшаўскі шлях», 1972

Аркадзь Куляшоў застанецца ў нашай паэзіі яе пяшчотным лірыкам, тым, кім ён і быў народжаны.

*Дзямідава, Л. "Ёсць у паэта свой аблог..."/ Л. Дзямідава // Бібліятэка прапануе. – 2013. - №11 – С.13-16.*

# УРОКІ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ А. КУЛЯШОВА

*Сцэнарый юбілейнай вечарыны*

*Я на ўсё жыццё абраў дарогу,*
*На якой калючак больш, чым руж*
*Сэрца – як набат, што б'е трывогу*
*За мільёны падгарматных душ.*
*А.Куляшоў*

**1 вяд.**

Аркадзь Куляшоў – народны паэт Беларусі, адзін з таленавітых і папулярных песняроў сучаснасці. Яго творчасць вызначаецца высокай паэтычнай культурай, рамантычнай прыўзнятасцю, філасафічнасцю, сувяззю з традыцыямі класічнай літаратуры і з фальклорам. Аркадзь Куляшоў стварыў выдатныя ўзоры беларускай паэзіі, у якіх з мастацкай паўнатой і пераканаўчасцю выяўлена гераічная сутнасць характару савецкага чалавека, раскрыт глыбокі сэнс яго мужнай барацьбы і самаадданай працы на розных гістарычных этапах.

**2 вяд.**

Нарадзіўся Аркадзь Куляшоў 6 лютага 1914 года на Магілёўшчыне ў мястэчку Самацэвічы Касцюковіцкага раёна ў сям'і настаўніка. У 1970 г. у паэме "Далёка да акіяна " А. Куляшоў пісаў пра родную хату, у якой прайшло маленства.

***Чытальнік:***

*Токам і адрынаю,*
*Правай палавінаю,*
*Кухняю гаротнаю,*
*Скрухай калаўротнаю*
*На краю сяла, -*
*Чым ты толькі родная,*
*Хата, не была?*

Сапраўды, у сялянскай хаце, бывала, і сушылі збожжа, і малацілі, і ткалі, а ў зімовыя дні яна часам была прытулкам і для маленькага цялятка – вялікай дзіцячай уцехі. Бацькі Куляшова, Кацярына Фамінічна Ратабыльская і Аляксандр Мікалаевіч Куляшоў, былі музычна адоранымі людзьмі. Бацька ў маладосці некалькі гадоў жыў у Маскве і спяваў у народнай оперы.

**1 вяд.**

Паэтычны талент А. Куляшова абудзіўся рана. Пісаць вершы ён пачаў з сямі гадоў, а ў 1926 г. Клімавіцкая раённая газета "Наш працаўнік" надрукавала яго верш "Ты мой брат". Аўтару было ў гэты час дванаццаць гадоў. Праз год было змешчана каля дзесяці вершаў у газеце "Магілёўскі селянін", а адзін верш быў надрукаваны нават у рэспубліканскай газеце "Беларуская вёска".

**2 вяд.**

У 1928 годзе, калі юнаму паэту было чатырнаццаць гадоў, у часопісе "Полымя" з'явіўся верш "Бывай…". Гэты твор быў народжаны першымі і шчырымі пачуццямі да вельмі прыгожай дзяўчыны – Алесі Карыткінай. Юны паэт і Алеся пазнаёміліся , калі ў 1925 годзе бацька Алесі прыехаў па нейкіх справах да бацькі Аркадзя, узяўшы з сабой дачку. Той было 13, а Аркадзю - 11.

**1 вяд.**

Вобраз першага кахання жыў у сэрцы А.Куляшова ўсё жыццё, і таму ён неаднойчы згадваў Алесю ў сваіх паэтычных творах, вяртаўся да раней напісаных радкоў, шліфаваў іх. Верш "Бывай…" стаў шэдэўрам выдатнага паэта і цудоўнай песняй "Алеся", якая набыла шырокую папулярнасць дзякуючы музыцы Ігара Лучанка і выкананню яе ансамблем "Песняры".

***Чытальнік:***

*Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся.*
*Бывай, смуглявая, каханая, бывай.*
*Стаю на ростанях былых, а з паднябесся*
*Самотным жаўранкам звініць і плача май.*

( Гучыць музычны твор "Алеся")

**2 вяд.**

У 1928 годзе, пасля заканчэння Самацэвіцкай сямігодкі, Аркадзь працягваў сваю вучобу ў Мсціслаўскім педагагічным тэхнікуме. У тыя гады Мсціслаў быў своеасаблівым цэнтрам пачынаючых паэтаў і празаікаў, якія групаваліся вакол студыі "Маладняка" – самай масавай тагачаснай літаратурнай арганізацыі ў Беларусі. Тут А.Куляшоў пазнаёміўся з таленавітымі пачынаючымі паэтамі Юліем Таўбіным і Змітраком Астапенкам, вершы якіх ужо друкаваліся тады ў цэнтральных газетах і часопісах. Творчая дружба з больш вопытнымі таварышамі станоўча ўплывала на далейшае развіццё паэтычных здольнасцей Куляшова. У гады вучобы ў Мсціслаўскім педтэхнікуме творы маладога паэта ўсё часцей і часцей сталі з'яўляцца на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў, а ў 1930 годзе выйшаў у свет першы яго зборнік вершаў "Росквіт зямлі". Большасць вершаў зборніка была створана пад непасрэдным уплывам падзей, што адбываліся ў вёсцы ў гады калектывізацыі. Яны сведчылі пра шчырае захапленне паэта энтузіязмам працоўных мас, веліччу перспектыў перабудовы беларускага краю.

***Чытальнік:***

*Адзінай кагортай, ячэйкай адзінай*
*Пад крок пяцігодак, пад грукат гадзін*
*Уздымем краіну, уславім краіну,*
*Край родны у творчай красе адрадзім!*

*"Пяцігодка"*

**1вяд.**

Тэма калектыўнай працы, усенароднага энтузіязму, якая ва ўяўленні паэта найчасцей асацыіравалася з "Мяцежным і радасным росквітам", была галоўнай ва ўсёй яго ранняй творчасці.

Важным этапам у жыцці Аркадзя Куляшова была яго вучоба на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута. У гэты час ён

настойліва і многа пісаў. У 1932 годзе, калі Аркадзю Куляшову было ўсяго васемнаццаць выходзяць новыя зборнікі вершаў “Па песню, па сонца!” і “Медзі дождж”. У іх аснове, так як і ў зборніку “Росквіт зямлі” – сцвярджэнне новага ў жыцці, бадзёрае апяванне “Радзімы каласістай”.

**2 вяд.**

У 1933 годзе выйшла паэма “Аманал”, у якой паэт ахоплівае даволі вялікі прамежак часу – ўстанаўленне ў краіне савецай улады і калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Падрабязным артыкулам на яе адгукнуўся Якуб Колас. Паэма Коласу не спадабалася: “Пабудавана яна пераважна на схемах, сімвалічнасці, на алегорыях… Жывых рэальных людзей у паэме не адчуваецца.” Разам з тым Колас, свядомы прыхільнік класічных традыцый, адзначае тое, што не заўважылі іншыя крытыкі паэмы: “Куляшоў у паэме “Аманал” ідзе нейкім новым, сваім шляхам, шукае новых сродкаў для рэалізацыі сваіх творчых замыслаў. Ён стараецца адысці ад тых прыёмаў і сродкаў літаратурнага арсенала, якія сталіся ўжо звычайнымі, трафарэтнымі”.

Куляшоў і сам самакрытычна ставіўся да сваіх твораў. У аўтабіяграфіі ён пісаў: “Нягледзячы на тое, што кніга за кнігай выходзяць з друку зборнікі маіх вершаў і паэм, - напісанае не задавальняе мяне. Разумею, што дрэнна, павярхоўна ведаю жыццё, а пра тое, што ведаю, пяю, як кажуць, не ўласцівым для мяне голасам.”

**1 вяд.**

Самай прыкметнай з’явай у творчасці А.Куляшова даваеннай пары стаў цыкл вершаў “Юнацкі свет” (1939-1940). Сюды ўваходзяць вершы “На сотай вярсце”, “Карусель”, “Бюро даведак”, “Воблака” і інш. Лепшыя з іх, як лічыць крытык У.Гніламёдаў, “кранталі натуральнасцю слова, абаяльнасцю інтанацый жывой гаворкі, шчырасцю і праўдзівасцю пачуццяў…”. “Юнацкі непаўторны свет” поўніцца пачуццем кахання да дзяўчыны, якая ўяўляецца “светлым ранкам” (“Бюро даведак”). Разам з тым герой паэта ўлюблёны ў свае родныя мясціны, на поўныя грудзі, па-маладому шчаслівы жыць на зямлі і сузіраць хараство. Аўтар стварыў непаўторны вобраз свайго сучасніка, свядомага будаўніка сацыялістычнага грамадства, настойлівага, мэтанакіраванага стваральніка.

***Чытальнік:***

*Я ўпарты, не кіну пачатае справы,*
*Каменне крышу,*
*Разграбаю пяскі,*
*Пад кпіны аматараў лёгкае славы*
*Капаю рэчышча ўласнай ракі.*

*“Мая Бесядзь”*

З цыкла вершаў “Юнацкі свет” пачынаецца сапраўдная творчасць Аркадзя Куляшова. Паэзія яго набывае тыя асноўныя якасна-самабытныя рысы, якія найбольш ярка выявіліся ў яго творах ваеннага часу.

**2 вяд.**

Першыя дні вайны засталі Аркадзя Куляшова ў Мінску, дзе ён сваімі вачыма бачыў варварскі бамбёж горада.

Пра сваё развітанне з родным горадам, з домам аўтар расказвае так: “24 чэрвеня 1941 года пакінуў разбураны фашысцкай бамбардзіроўкай, ахоплены пажарам Мінск. Пеша прайшоў горкі шлях ад Мінска да Оршы. Цягнікам даехаў да Калініна, дзе дабраахвотна ўступіў у рады Чырвонай Арміі. З Калініна быў пасланы ў ваенна-палітычнае вучылішча пад Ноўгарадам, а адтуль накіраваны на службу ў армейскую газету “Знамя Советов”.

**1 вяд.**

Тое, што ўбачыў паэт у першыя дні фашысцкай навалы, урадзіла душу сваім трагізмам і нечаканасцю і нашчэнт развеяла яго ранейшыя ўяўленні аб вайне.

***Чытальнік:***

*Як ад роднай галінкі дубовы лісток адарван,*
*Родны Мінск я пакінуў,*
*Нямецкай бамбёжкаю гнаны.*
*Міма дрэў, міма дрэў*
*Усю ноч я ішоў, - за спіною*
*Родны горад гарэў,*
*І не ведала сэрца спакою.*

*(Сцяг брыгады)*

**2 вяд.**

На старонках армейскага друку з’яўляюцца палымяныя вершы: “Балада аб чатырох заложніках”, “Над брацкай магілай”, “Камсамольскі білет”. Вялікім пачуццём болю напоўнены верш “Ліст з палону” (1942) – зварот дзяўчыны, якую вывозяць у фашысцкую няволю.

***Чытальнік:***

*Я рабыня, рабыня,*
*Я чорная, чорная, чорная,*
*Любы мой, не з табой,*
*А з праклятай бядой*
*Заручоная…*
*… Ты прыйдзі, ты адпомсці, мой мілы,*
*Не прашу за сябе, -*
*За зямлю, што нас лёгка насіла.*

Здаецца, што гэта сама Беларусь спавядаецца, гаворыць пра свой трагічны лёс, просіць заступіцца і абараніць яе ад рабства, кліча адпомсціць ворагу за патаптаны гонар і ўчынены гвалт.

**1 вяд.**

У гады вайны А.Куляшоў стварыў балады, элегіі, лірычныя і лірыкапубліцыстычныя вершы (“Віцебская махорка”, “Маці”, “Галубка” і інш.), а таксама паэмы “Сцяг брыгады” (1943), “Прыгоды цымбал” (1944) і “Дом №24” (1944). Асабліва каштоўнае ў гэтых творах – псіхалагічная глыбіня пачуццяў пра перажытае і выпакутаванае чалавекам ва ўмовах ваеннага ліха.

**2 вяд.**

Пад грукат гармат у 1942 годзе напісаў Аркадзь Куляшоў паэму “Сцяг брыгады”. Гэта быў першы буйны твор аб Вялікай Айчыннай вайне не толькі ў

беларускай, але і ва ўсёй савецкай літаратуры. Паэма захапляла суровай праўдай вайны, лірычнасцю, сардэчнасцю і паэтычным майстэрствам. У 1946 годзе за паэму “Сцяг брыгады” паэту была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. У першых вершах, напісаных пасля Перамогі над фашысцкай Германіяй: “Сланечнік”, “Колас”, “Вяселле”, “Чмель”, “Крылы” і інш. – услаўляецца радасць мірнай працы і хараство жыцця на вызваленай зямлі.

**1 вяд.**

У першыя пасляваенныя гады выйшлі з друку новыя кнігі народнага паэта – “На сотай вярсце” (1945), “Вершы” (1947), “Выбраныя вершы і паэмы” (1948).

Кандрат Крапіва 11 сакавіка 1950 года на старонках газеты “Літаратура і мастацтва” так характарызаваў творчасць Аркадзя Куляшова першых пасляваенных гадоў: “У нас ёсць нямала прыкладаў, калі пісьменнікі па-сапраўднаму змагаюцца за якасць літаратуры і дабіваюцца значных вынікаў… Возьмем хоць бы Аркадзя Куляшова, які, можа, найбольш плённа змагаўся за якасць у сваёй творчасці і дабіўся значных поспехаў, прымножыўшы здабыткі беларускай паэзіі. У працы Аркадзя Куляшова праявіліся дзве выдатныя якасці… Куляшоў узнімае важнейшыя актуальныя палітычныя тэмы, якія хвалююць усю нашу грамадкасць, і вырашае гэтыя важнейшыя тэмы паэтычнымі сродкамі…”.

**2 вяд.**

У 1951 годзе выйшла кніга “Камуністы”, у якую, апрача вершаў, увайшлі паэмы “Новае рэчышча”, “Перамога” “Простыя людзі”, “Толькі ўперад”, “Песня аб слаўным паходзе”. За паэму “Новае рэчышча” Аркадзю Куляшову ў 1949 годзе была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. У паэме ўславіў паэт гераічную працу па пераўтварэнню прыроды і паказаў вялікі энтузіязм савецкага народа ў першыя мірныя гады.

**1 вяд.**

У другой палове 50-х -60-х гг. у свядомасці паэта адбылася змена поглядаў і арыенціраў, ён выйшаў на якасна іншы ўзровень светапазнання.

А. Куляшоў істотна паглыбіў інтэллектуальны і філасофскі пачатак у сваёй творчасці. Паклаў пачатак новаму этапу зборнік “Новая кніга”(1962).

У вершах “Новай кнігі” паэт вядзе шчырую, усхваляваную размову з ХХ стагоддзем.

***Чытальнік:***

*Мне кожны год, нібы жыццём другім*
*Жыць ў дваццаты век наш давялося,*
*Я – акіяну жытняга калоссе:*
*Мільёны лёсаў змешчаны ў маім*
*Яшчэ да дна не вычарпаным лёсе.*

**2 вяд.**

Аснову светабачання паэта складаюць думкі-развагі пра быццё чалавека ў часе і прасторы, пра лёс чалавецтва, Зямлю і сусвет. Крытык В.Бечык у кнізе пра А.Куляшова “Шлях да акіяна” (1981) адзначыў, што “касмічны” ракурс надаў навізну і надзённасць паэтавым разважанням, “новае…гучанне трымала гуманістычнае сцвярджэнне чалавечнасці, шчырасці, дабраты, абвострана

выявіўся драматызм сучаснага быцця чалавецтва”, пры гэтым у куляшоўскіх творах “перавышае пафас засяроджанага роздуму”.

**1 вяд.**

У 60-70-я гг. А.Куляшоў паказаў сябе выдатным майстрам паэтычнага эпасу. Ён стварыў паэмы “Цунамі”, “Далёка да акіяна”, “Варшаўскі шлях”, “Хамуціус”. “Цунамі” (1968) – лірыка-філасофскі твор. Яго яшчэ называюць паэмай-прытчай. Героі “Цунамі” – Ён і Яна. Закаханыя, яны ўцякаюць у акіянскія прасторы, каб ізаляваццa ад цывілізацыі на бязлюдным востраве. Але апынуцца па-за часам, грамадствам не атрымліваецца. У паэме Аркадзь Куляшоў асэнсоўвае супярэчнасці складанай эпохі, пранікае ў псіхалогію сучаснікаў, адлюстроўвае асноўныя тэндэнцыі і асаблівасці жыцця.Сёння паэма А.Куляшова ўспрымаецца як папярэджанне сучаснай цывілізацыі пра экалагічную катастрофу, заклік да гуртавання вакол агульначалавечых каштоўнасцяў. Аўтар сцвярджае адказнасць Чалавека перад часам і чалавецтвам.

***Чытальнік:***

*Няма шляхоў да самазахавання,*
*Няма дарог да светазабыцця*
*У час ліхі ўзаемапалявання*
*Сіл супрацьлеглых:смерці і жыцця.*
*Адзінства гартаваць людзей павінна,*
*Каб раз’яднанасць не магла ў бацькоў*
*Бацькоўства адабраць, пазбавіць сына*
*На хлеб і сонца спадчыных правоў.*

**2 вяд.**

1 лістапада 1968 года А.Куляшову прысвоена Ганаровае званне Народнага паэта БССР.

Аркадзь Куляшоў выявіў сябе яшчэ як таленавіты, глыбокі перакладчык. За дзейнасць у галіне мастацкага перакладу ён быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі ў 1970 годзе. Куляшоў тонка адчуваў індывідуальную адметнасць кожнага з тых аўтараў, што цудоўна загучалі на беларускай мове. Ён пераклаў “Энеіду” украінскага паэта Івана Катляроўскага, славуты “Спеў аб Гаяваце” Генры Лангфэла, паэму “Цыганы” і раман у вершах “Яўгеній Анегін” Аляксандра Пушкіна. Паэтам пераўтвораны па-беларуску многія творы Міхаіла Лермантава, Тараса Шаўчэнкі, Сяргея Ясеніна і інш.

**1 вяд.**

А.Куляшоў быў узнагароджаны двума ордэнамі Леніна (1948 і 1949), ордэнам Чырвонага Сцяга (1943), двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага сцяга (1956 і 1974) і многімі медалямі.

Аркадзь Куляшоў  надаў высокі філасофскі ўзровень беларускай паэзіі. Паэт не ўсведамляў сябе па-за агульназначнымі праблемамі чалавечага быцця, раскрываў агульначалавечае праз глыбока асабістае ўспрымане рэчаіснасці і свету наогул. Ён узбагаціў традыцыі беларускага верша, пашырыў яго вобразна-выяўленчыя і стылёвыя магчымасці.

**2 вяд.**

4 лютага 1978 года Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў заўчасна памёр ў Нясвіжы.

У яго паперах знайшліся 4 вершы, напісаныя ў апошні дзень жыцця. Напэўна, самым вядомым з іх стаў верш "Карусель".

***Чытальнік:***

*Дзе ж вы, дзе, майго дзяцінства коні,*
*Паскакалі без мяне куды вы?*
*Больш не чутна за спіной пагоні…*
*Дзе спынілі вы свой бег імклівы?..*
*Праплывае міма пабрацімства,*
*Коні, коні дыхаюць гарача.*
*Каруселі кружаць, а дзяцінства*
*Убаку стаіць маё – і плача.*

**1 вяд.**

Беларуская, уся шматнацыянальная савецкая літаратура панесла цяжкую страту: памёр паэт, чыя шматгадовая творчая дзейнасць – узор служэння народу.

Імя Аркадзя Куляшова прысвоена Магілёўскаму педагагічнаму універсітэту, дзе перыядычна (з 1984 г.) адзін раз у 5 гадоў праводзяцца Рэспубліканскія Куляшоўскія чытанні; сярэднім школам у Мінску і Саматэвічах, вуліцам у Мінску і Касцюковічах. На доме, у якім ён жыў, усталявана мемарыяльная дошка. З 1979 года ў Рэспубліцы аўтарам лепшых мастацкіх твораў прысуджаецца літаратурная прэмія імя Аркадзя Куляшова.

***Чытальнік:***

*Ёсць у паэта свой аблог цаліны,*
*Некрануты прастор для баразён,*
*дзе ён працуе з першае хвіліны*
*і да апошніх вечаровых дзён;*
*Ёсць думак прагавітае насенне,*
*У жменю назбіранае з дарог,*
*Што спелага чакае ўвасаблення,*
*Заліўшы хваляй жытняю аблог;*
*Ёсць сэрца маладое, без якога –*
*Без палкага, жывога пачуцця –*
*Няма у яго нічога: ні аблога,*
*Ні плённых дум, ні самага жыцця.*

*Аркадзь Куляшоў*

Дзякуем за ўвагу! Да сустрэчы!

# “ІМГНЕННЯЎ ПАЭТЫЧНЫХ ХАРАСТВО”

*Сцэнарый літаратурна –музычнай кампазіцыі*

**Абсталяванне:** партрэт А. Куляшова, выстава кніг паэта, фоназапіс песні “Алеся”

**Вядучы.** Хутка бягуць гады. Але, колькі б часу ні прайшло, заўсёды будзе жыць у памяці людской Аркадзь Куляшоў – народны паэт Беларусі, якому і прысвечана сённяшняя вечарына. Мы паспрабуем яшчэ раз прайсці жыццёвымі сцежкамі паэта, пашырыць веды аб яго творчасці.

**Чытальнік.** А. Куляшоў нарадзіўся 6 лютага 1914 года ў вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям’і настаўнікаў.

З хаты пачынаецца
Кут, што людзям люб.
Хата ў птушкі маецца,
У крыніцы – зруб,
Што ў гады далёкія
Прадзеды-дзяды
Ёй рубілі з вокнамі,
З брамкай– для вады, –
Каб цяклі струменьчыкі,
Пакідалі лог,
Як акно –агеньчыкі,
Як сляды –парог…

**Чытальнік.** Выток паэзіі А. Куляшова якраз там, на малой радзіме, у Саматэвічах, што на Магілёўшчыне. А рэчку Бесядзь, – яна працякае побач з мястэчкам, Куляшоў лічыў ракой свайго лёсу – чалавечага і творчага. Лес – гэта сасновы бор Цыкуны, апеты ў вершы “Маё сэрца ў бары”.

Кожны мае свой бор,
Родны бор на зямлі,
Бор, дзе мары,
Як гордыя сосны раслі…

**Чытальнік.** На вялікі жаль, тая самая Бесядзь, у старыцах якой зусім нядаўна раслі белыя лілеі і ў затоках якой хлопцы лавілі ракаў, сёння прыкметна абмялела. Не чуваць на мурожных берагах людской гамонкі, як не чуваць яе і на вуліцах Саматэвічаў, прысыпаных чарнобыльскім попелам.

**Вядучы.** Вучыўся А. Куляшоў у Саматэвіцкай сямігодцы. Пасля заканчэння школы Аркадзь Куляшоў паступіў вучыцца ў Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум. З 1931 г. па 1933 г. Аркадзь Куляшоў вучыўся на літаратурным факультэце ў Мінскім педагагічным інстытуце.

**Чытальнік.** Я пакідаў маленства край,
Дзе жыў жыццём вясёлым,

Прыйшла і мне чарга «бывай»
Сказаць лясам і долам.
Глядзелі зоры на мяне
Здалёк, як на другога,
Нібы за жорава мяне
Лічылі маладога.
Адчуў я прагу вышыні,
Зямля дала мне сілы,
Мяне ўзнялі юнацтва дні -
Майго адлёту крылы…

**Вядучы.** Паэту было дванаццаць гадоў, калі з'явіўся яго першы верш. Верш быў надрукаваны ў Клімавіцкай акруговай газеце "Наш працаўнік" пад псеўданімам Аркадзь Дуда і называўся "Ты мой брат".
Творчая дружба з Юліем Таўбіным і Змітраком Астапенкам станоўча ўплывала на далейшае развіццё паэтычных здольнасцей паэта.

**Чытальнік.** Не бачыўся я ўсё жыццё амаль
З сябрамі незабыўнымі маімі.
Зноў выклікае на размову з імі
Навекі разлучыўшая нас даль.
Каня свайго сядлаю і ў дарогу,
Цяжэйшую з усіх былых дарог,
Кіруюся адзін, - як маналог
На пошукі жывога дыялогу.
Не прыпыняйся, не жахайся слова!
Хай адвячорак доўгім ценем лёг -
Магчыма немагчымая размова.
Датуль, пакуль магчымы маналог.

**Вядучы.** Праз год было змешчана каля дзесяці вершаў у газеце "Магілёўскі селянін", а адзін верш быў надрукаваны нават у Рэспубліканскай газеце "Беларуская вёска".

У 1928 годзе, калі юнаку было чатырнаццаць гадоў, у часопісе "Полымя" з'явіўся яго верш "Бывай" – першы варыянт яго будучай песні "Алеся", якая набыла шырокую папулярнасць, дзякуючы музыцы Ігара Лучанка і выкананню яе ансамблем "Песняры".

**Чытальнік.** Ці помніш першае нясмелае прызнанне?
Над намі жаўранкам звінеў і плакаў май.
Назаўтра золкае, туманнае світанне,
Суровы позірк твой і мой нямы адчай.
Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся.
Бывай, смуглявая, каханая, бывай.
Стаю на ростанях былых, а з паднябесся
Самотным жаўранкам звініць і плача май.

**Вядучы.** Першае каханне. Няспраўджанае, непадзеленае, безнадзейнае ці шчаслівае… Каго яно не абмінула? І ці для многіх засталося адзіным? Моцным было пачуццё юнага паэта да дзяўчыны з імем Алеся.

Каханне чатырнаццацігадовага хлапчука да шаснаццацігадовай дзяўчыны было толькі марай, летуценнем. Але мара гэтая аказалася роднаснай таму моцнаму ўздыму, які выклікала яшчэ ў васьмігадовага Аркадзя высокая паэзія. Ён рос настолькі ўражлівым, што не мог без слёз чытаць паэму М. Лермантава "Мцыры"!

**Вядучы.** Беларуская паэзія не ведала, здаецца, другога такога ранняга і хуткага творчага ўзыходу. У шаснаццаць гадоў з'явілася першая кніга "Росквіт зямлі", у васямнаццаць – яшчэ дзве – "Па песню, па сонца!" і "Медзі дождж".
Але А. Куляшоў не спыняецца на дасягнутым, яго не задавальняе напісанае, ён шмат працуе над удасканаленнем свайго паэтычнага майстэрства.
Вынікам яго ўпартых пошукаў сталі вершы 1938-1940 гадоў, якія склалі кніжку пад назвай "Юнацкі свет".
Красою і свежасцю палоняць вершы "Юнацкага свету", тут сама маладосць расказвае пра сябе, даверліва, адкрыта.

**Вядучы.** Яшчэ перад Вялікай Айчыннай вайной на першай Дэкадзе беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве ўпершыню пачулі цудоўныя вершы маладога паэта.
Юнацкая летуценнасць не засланяла ад яго вялікай адказнасці за сённяшняе і будучае Радзімы, за лёс свайго народа. Паэта радуюць вялікія пераўтварэнні ў краіне і адначасова трывожыць прадчуванне суровай бітвы…

**Вядучы.** 24 чэрвеня 1941 года паэт пакінуў разбураны фашысцкай бамбардзіроўкай, ахоплены пажарам Мінск. Пешшу прайшоў горкі шлях ад Мінска да Оршы. Цягніком даехаў да Калініна, быў пасланы ў ваенна-палітычнае вучылішча пад Ноўгарадам, а адтуль – на службу ў армейскую газету "Знамя Советов".

**Вядучы.** Ён апрануў шынель, каб бараніць Радзіму ад ворага, і прайшоў праз суровыя выпрабаванні, прыняўшы ў сэрца бязмежнае народнае гора. Ва ўмовах франтавога жыцця А. Куляшоў здолеў напісаць выдатныя мастацкія творы за незвычайна кароткі час. ("Сцяг брыгады", "Балада аб чатырох заложніках", "Камсамольскі білет", "Ліст з палону", "Над брацкай магілай" і інш.). Гэтыя творы ў гады вайны не толькі гаварылі суровую праўду пра пакуты і мужнасць нашага народа — яны былі і застаюцца крыніцай духоўнай сілы чалавека.

**Чытальнік.** Сябры, каго вайна скасіла кулямі,
Дыханне ваша чую за спіной.
Зноў грозна, разварушанымі вуллямі,
Гудуць франты…
Не ціхне вечны бой.

**Чытальнік.** Паэзія А. Куляшова шматгранная, яго вершы славяць прыгажосць роднага краю, мірнае жыццё, чалавека працоўнага подзвігу.

Вось чаму сёння,
у мірны наш дзень, пасля бою,
Рад я за песню,
што выстаяла ў барацьбе,
Але найбольш, мой патомак,
я рад за другое –
Рад, што жыццё
здабылі мы сабе і табе.
Песня мая
не красуняю-кветкай з паляны,
Песня мая пехацінцам
увойдзе ў твой дом,
Ты ёй даруй
і глыбокія шрамы, і раны,
Знай, што і ім
ты сваім абавязан жыццём.

**Вядучы.** А. Куляшоў – адзін з самых таленавітых песняроў Беларусі, класік нацыянальнай літаратуры. Ён вядомы і як сцэнарыст. Паэт напісаў сцэнарыі да фільмаў “Першыя выпрабаванні”, “Чырвонае лісце”, “Запомні гэты дзень”.

**Вядучы.** А яшчэ А. Куляшоў – добры перакладчык. “Цыганы”, “Яўгеній Анегін” А. Пушкіна, “Энеіда” І. Катлярэўскага, “Мцыры” М. Лермантава, “Спеў аб Гаяваце” Г. Лангвела і інш.

**(Голас за кадрам)**
А калі ў смяротным грозным гуле
Упаду я, кінуты на дол
Ранняю хваробай або куляй,
І асірачу пісьмовы стол, -
Аб такім не пашкадую лёсе,
Бо, юнацкі помнячы зарок,
Паўтарыў бы зноў, каб давялося,
Я жыццё сваё - за крокам крок.
(Гучыць матыў песні “Алеся” сл. А. Куляшова, муз. І. Лучанка).

## ПАЗНАВАЛЬНАЯ ВІКТАРЫНА

1. Колькі гадоў было А. Куляшову і які першы верш надрукавала газета "Наш працаўнік"?
   *(верш "Ты мой брат". А. Куляшову было 12 гадоў)*

2. Які верш быў прысвечаны прыгожай дзяўчыне Алесі Карыткінай, які набыў шырокую папулярнасць дзякуючы ансамблю "Песняры".
   *(песня "Алеся" на верш "Бывай...")*

3. Творы якіх вядомых паэтаў перакладаў А.Куляшоў на беларускую мову?
   *(А.Пушкіна, М. Лермантава, Т. Шаўчэнкі, І.Катляроўскага, С.Ясеніна і др.)*

4. За якую паэму ваенных гадоў А.Куляшову была прысуджана ў 1946 годзе Дзяржаўная прэмія СССР.
   *("Сцяг брыгады")*

5. У якім зборніку вершаў паэт вядзе шчырую, усхваляваную размову з XX стагоддзем.
   *(Зборнік вершаў "Новая кніга")*

6. Назавіце філасофскую паэму А.Куляшова з незвычайнай назвай, у якой аўтар сцвярджае адказнасць чалавека перад часам і чалавецтвам.
   *("Цунамі")*

7. Якімі ордэнамі ўзнагароджаны А.Куляшоў?
   *(Двума ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага сцяга)*

8. У якім годзе паэту прысвоена ганаровае званне Народнага паэта БССР?
   *(12 лістапада 1968 г.)*

9. Назвы некаторых вершаў А. Куляшова напамінаюць яго родныя мясціны. Назавіце гэтыя вершы. *("Мая бесядзь", "Станцыя Камунары")*

10. Успомніце паэмы Аркадзя куляшова, названыя імёнамі галоўных герояў.
    *("Антон Шандабыла", "Баранаў Васіль")*

11. Назавіце передваенны твор паэта, дзе ён гаворыць аб цяжкіх выпрабаваннях свайго пакалення ў будучай вайне.
    *( Паэма "Хлопцы апошняй вайны")*

12. Які верш ваеннага часу паэта карыстаўся выключным поспехам у чытачоў-воінаў?
    *("Ліст з палону")*

13. Назавіце твор, які пачынаецца радкамі:
    "Як ад роднай галінкі дубовы лісток адарваны,

родны Мінск я пакінуў, нямецкай бамбёжкаю гнаны”.
*(Паэма “Сцяг брыгады”)*

14. Аб якой паэме А. Куляшова А. Твардоўскі пісаў, што яна з’яўляецца “голасам сэрца, поўнага болю за родную беларускую зямлю, плачам па ёй і гарачай светлай верай ў яе сілы…ў яе вызваленне”?
*(Аб паэме “Сцяг брыгады”)*

15. У якім вершы-баладзе камсамолец на аддаў ворагам свой камсамольскі білет і быў “абліты вадой ледзяною”?
*(У вершы “Камсамольскі білет”)*

16. У якіх творах паэта гучыць тэма чалавечага шчасця?
*(У паэмах “Сцяг брыгады”, “Толькі ўперад”, “Грозная пушча”)*

17. У якіх паэтычных жанрах выступіў паэт у літаратуры?
*(Лірычны верш, гераічная балада, паэма)*

18. Назавіце творы рускай літаратуры, перакладзеныя паэтам на беларускую мову.
*(“Цыганы”, “Яўген Анегін” А. Пушкіна, “Вершы аб савецкім пашпарце” У. Маякоўскага)*

19. Які паэт перакладаў шмат твораў Куляшова на рускую мову?
*(М. Ісакоўскі)*

20. За якія творы паэту прысуджаны дзяржаўныя прэміі?
*(“Сцяг брыгады”, “Новае рэчышча”).*

## ДАДАТКОВЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ДА ПРАВЯДЗЕННЯ ВІКТАРЫН

**Аркадзь Куляшоў**
*«Спакойнага шчасця не зычу нікому...»*

1. У паэта ёсць верш «Маё пасведчанне», дзе ён гаворыць аб годзе свайго нараджэння:
«Дадзена яно сабе самому
У тым, што нарадзіўся ў год вайны.
Нянек не было ў мяне, вядома,
Песень не спявалі мне яны».
Які гэта год? У якім яшчэ творы паэт апісвае падзеі гэтага года?

*1914; у паэме «Крыўда».*

2. Назвы некаторых вершаў А. Куляшова напамінаюць яго родныя мясціны. Назавіце гэтыя вершы.

*«Мая Бесядзь», «Станцыя Камунары».*

3. Колькі было год пачынаючаму паэту, калі быў надрукаваны першы яго верш? Успомніце назву верша. Як падпісаў яго паэт?

*12 год; «Ты, мой брат»; А. Дуда.*

4. Аб якім творы рускага паэта Аркадзь Куляшоў пісаў, што ён «як паэт сваім нараджэннем абавязан іменна гэтаму твору»?

*Аб паэме «Краіна Муравія» А. Твардоўскага.*

5. Успомніце паэмы Аркадзя Куляшова, названыя імёнамі галоўных герояў.

*«Антон Шандабыла», «Баранаў Васіль».*

6. Назавіце перадваенны твор паэта, дзе ён гаворыць аб цяжкіх выпрабаваннях свайго пакалення ў будучай вайне.

*Паэма «Хлопцы апошняй вайны».*

7. З якога твора наступныя радкі? Каму ён прысвечан?
«Іх вядуць па жытняй сцяжынцы.
Чатырох.
Пад канвоем.
З дому.
Чатырнаццаць старэйшай дзяўчынцы,
Тры гады хлапчуку малому.
Разам з імі ў падвал халодны
Гоняць цётку — сястру Міная».

*З верша «Балада аб чатырох заложніках»;*
*Бацьку Мінаю, Мінаю Пііпавічу Шмырову, партызанскаму камандзіру.*

8. Які верш ваеннага часу паэта карыстаўся выключным поспехам у чытачоў-воінаў?

*«Ліст з палону».*

9. Назавіце твор, які пачынаецца радкамі:
«Як ад роднай галінкі дубовы лісток адарваны,
Родны Мінск я пакінуў, нямецкай бамбёжкаю гнаны».

*Паэма «Сцяг брыгады».*

10. Аб якой паэме А. Куляшова А. Твардоўскі пісаў, што яна з'яўляецца «голасам сэрца, поўнага болю за родную беларускую зямлю, плачам па ёй і гарачай светлай верай у яе сілы... у яе вызваленне»?

*Аб паэме «Сцяг брыгады».*

11. У якім вершы-баладзе камсамолец не аддаў ворагам свой камсамольскі білет і быў «абліты вадой ледзяною»?

*У вершы «Камсамольскі білет».*

12. У якім вершы паэт гаворыць, што ён хоча Беларусь «пеша ўсю... змераць», хоча бёларускіх «наглытацца... туманоў,...ветру, і пылу»? Што сказаў аб гэтым вершы Кузьма Чорны?

*У вершы «Над брацкай магілай»;*
*«Бомбу прынёс Куляшоў»,— сказаў К. Чорны*
*ў рэдакцыі аб гэтым вершы.*

13. З якога верша радкі:
«Я хачу, каб называўся камуністам
Родны сын мой, а таксама сынаў сын»?
У сувязі з якой знамянальнай датай ён быў напісан?

*З верша «Камуністы»; да стагоддзя*
*«Камуністычнага маніфеста».*

14. Да каго звяртаецца паэт у гэтых радках:
«На бомбу я накладаю
Сваё законнае вета,—
Я сына малога маю,
Хай знаюць усе пра гэта»?
Як называецца верш?

*Да падпальшчыкаў новай вайны;*
*«Слова да Аб'яднаных Нацый».*

15. У якіх творах паэта гучыць тэма чалавечага шчасця?

*У паэмах «Сцяг брыгады», «Толькі ўперад», «Грозная пушча».*

16. Назавіце жаночае імя, якое часта сустракаецца ў творах паэта.

*Алеся.*

17. Успомніце некалькі вершаў, якія ўвайшлі ў зборнік «Новая кніга».

*«На пасадзе цяжкой», «Размова з патомкам»,*
*«Пра вечнае пяро», «Аб любві», «Вянок», «Да паэзіі».*

18. У якіх паэтычных жанрах выступіў паэт у літаратуры?

*Лірычны верш, гераічная балада, паэма.*

19. Назавіце творы рускай літаратуры, перакладзеныя паэтам на беларускую мову.

*«Цыганы», «Яўгені Анегін» А. Пушкіна.*
*«Вершы аб савецкім пашпарце» У. Маякоўскага.*

20. Які паэт пераклаў шмат твораў А. Куляшова на рускую мову?

*М. Ісакоўскі.*

21. За якія творы паэту прысуджаны Дзяржаўныя прэміі?

*«Сцяг брыгады», «Новае рэчышча».*

22. Хто сказаў аб паэце: «У Беларусі ёсць салавей паэзіі Аркадзь Куляшоў»?

*А. Талстой.*

23. Сцэнарыі якіх фільмаў былі напісаны А. Куляшовым у садружнасці з А. Кучарам?

*«Чырвонае лісце», «Першыя выпрабаванні».*

## ПЫТАННІ ДА ТВОРАЎ А. КУЛЯШОВА АДКУЛЬ ГЭТЫЯ РАДКІ

1. «Адзінай кагортай, ячэйкай адзінай
Пад крок пяцігодак, пад грукат гадзін
Уздымем краіну, уславім краіну,
Край родны у творчай красе адрадзім!»
*«Пяцігодка».*

2. «Шлю падзяку вёснам і сябрам,
Жытнім копам на шырокім полі...
Маладосць! — я ўсё табе аддам,
Не сыду з дарог тваіх ніколі».
*«Маладосць».*

3. «Хачу неспакойнаю хмарай грымець,
Маланкамі ўвесь апавіты,

Каб цяжка адразу было зразумець
Ці вокам акінуць, які ты.
Спакою не ведаць ні ноччу, ні днём
І не прыставаць у знямозе,
Вялікай любові дажджом
І агнём
Зямлю цалаваць па дарозе».
*«Плыла, цалавалася хмара з зямлёй».*

4. «Мы сяброў засыпаем зямлёй —
Ленінградцы, татары, узбекі,
Мы клянёмся варожай крывёй
Напаіць беларускія рэкі».
*«Над брацкай магілай».*

5. «Толькі трэба яго
Не шукаць, не лавіць,
Трэба шчасце ў суровым
Змаганні здабыць.
Шчасце ў працы, у светлым
Здзяйсненні надзей,
Шчасце ў тым, каб змагацца
За шчасце людзей».
*«Толькі ўперад».*

6. «Пазбавіўшы ад грознага відовішча
Свет, не дазволю я, каб дым і пыл
Зямлю ператварыў у бамбасховішча,
Мільярд прапісак — у маўклівы
прысак,
Мільярд калысак — у мільярд магіл».
*«Я хаце абавязаны прапіскаю...»*

## З ЯКІХ ВЕРШАЎ ГЭТЫЯ МАЛЮНКІ ПРЫРОДЫ

1. «Светлых дзён баючыся,—
Мутнымі ручаямі
На пачарнеўшай крызе
Зіма ўцякае начамі».
*«Светлых дзён баючыся...»*

2. «Узнялося, узнялося
Ранне
Чырванню-зарою,
Захісталася калоссем,
Заіскрылася расою».
*«Раніца».*

3. «Радасна і сумна шалясцяць асіны,
Радасна і сумна шалясцяць дубы.
У кляновых лісцях віснуць павуціны,
У срабрыстых ніцях жоўтыя сады».
*«Гоман жаўталісця»*

4. «Адшумела лета каласамі,
У паплавах зялёных адцвіло;
Журавы на поўдзень пад крыламі
Паняслі ліпнёвае сяло...»
*«Малацьба».*

## ПЫТАННІ ДА ПАЭМЫ «СЦЯГ БРЫГАДЫ»
## ХТО З ГЕРОЯЎ ПАЭМЫ...

1. ...быў пастаўлен каля брыгаднага сцяга?
*Алесь Рыбка.*

2. ...«Не скарылася пану яна,
Шлюбу не адбылося,
Удавілася рана яна
Пад акном на бярозе»?
*Жонка Ворчыка.*

3. ...«па струнах...
водзіць светлым смычком
пад прымусам»?
*Бацька маладой.*

4. ...думаў:
«Сцяг вынесем...
І даб'ёмся загаду,
Каб загінуўшую наноў
Аднавілі брыгаду»?
*Камісар Зарудны.*

5. ...верыць, што
«да Урала дакацілася немцаў навала»?
*Лізавета.*

6. «...судзіўся калісь за падпал
Птушкаводчае фермы.
Стаў ён старастам, хату прыдбаў
І балюе цяпер ён...»?
*Мядзведскі.*

7. ...«гавораць употай з Масквой»?
*Партызаны.*

8. ...«забыў ...кроў сяброў, іх адвагу, чэсць забітых байцоў»?
*Ворчык.*

9. «Не знайшоў забыцця, не знайшоў
Сваёй жонкі Марыны».
*Ворчык.*

## ГАВОРАЦЬ ГЕРОІ ПАЭМЫ

1. «...Бо шчаслiўцам нiколi не быў,
Быць такiм не жадаю.
Не хачу сабе долi такой
У часы, калi гора
Разлiлося слязьмi i крывёй
Скрозь ад мора да мора».
*Алесь Рыбка*

2. « — Праважаю вас, таварышы,
Нiбы родных сыноў я».
*Праскоўя.*

3. «Ферму я падпалiў? Падпалiў.
Прызнаюся вам, людзi.
Пеўнi тыя, што з дымам пусцiў,
Мяне вывелi ў людзi!»
*Мядзведскi.*

4. « — Ты... не ў людзi пайшоў,
А ў Iуды...
Табе ўродзiць зямля камянi,
А не жыта — у жнiўныя днi».
*Камiсар Зарудны.*

5. «...Будзе люба нам жыць i ў горы,
Будуць цiха свяцiць нам зоры,
Залатыя месяца рожкi...
Нi вайны табе, нi бамбёжкi».
*Лiзавета.*

6. «Мне абрыдла сонца, жыццё,
Засталася надзея —
Можа з жонкай знайду забыццё
У бядзе я?»
*Ворчык.*

7. «Не, не гэтак прыйду я ў дом,
З новай каскай прыйду, са штыком.
Не нiкчэмным, слабым жабраком,
А як бацька прыйду я ў дом,

Сонца ў дом
Прынясу на штыку,
Малаком
Напаю дачку,
Пасаджу свайго сына я
На жывога,
На баявога
Каня».
*Алесь Рыбка.*

## ПЫТАННІ ДА ПАЭМ А. КУЛЯШОВА

1. Успомніце эпізод, якім пачынаецца паэма «Баранаў Васіль».
*Васіль у дазоры, напад ворага, бой.*

2. З якой паэмы гэтыя заключныя радкі:
«На сонечнай просіні —
Хмаркі радамі.
Калгасная восень
Багата дарамі»?
*«У зялёнай дуброве».*

3. Аб чым расказвае паэт у гэтым творы?
*Аб жыцці калгаснай вёскі*

4. У якой паэме Аркадзь Куляшоў увасобіў у вобразе цымбал бессмяротную душу народа, яго мастацтва?
*У паэме «Прыгоды цымбал».*

5. Які сэнс заключаецца ў радках паэмы:
«Струны рваць спрабавалі
З цымбалаў,
Як жылы з людзей,
І штыкамі ігралі,—
Маўчалі яны, як раней.
Ні агонь, ні астрог
Знішчыць тыя цымбалы не мог»?
*Паэзія жыве з народам і ніколі яму не здрадзіць*
*— такі сэнс гэтых радкоў.*

6. Ідэйную накіраванасць якой паэмы Аркадзь Куляшоў вызначыў так:
«Шчасце здабудуць
Сабе назаўсёды — так будзе! —
Гордасць і слава зямлі нашай —
Простыя людзі»?
*«Простыя людзі».*

7. Назавіце галоўнага героя паэмы.

*Мірон Гукай.*

8. Што здарылася з ім на вайне?
*Ён быў засыпаны зямлёю.*

9. Хто дае Гукаю такую характарыстыку:
«Трэба, каб з сэрцаў
Імя старшыні не знікала.
Ён заслужыў гэта,
Можна сказаць аб ім смела —
З першага дня
Кіраваў гаспадаркай умела.
Верны быў справе,
Свінца не баяўся, жалеза»?
*Старшыня таго калгаса, дзе працаваў да вайны Мірон Гукай.*

10. Герой якой паэмы адказвае на ўсе лісты, якія прыходзяць у дом, бо ён — першы ў ім жыхар?
*«Дом № 24».*

11. Як называецца паэма, галоўнымі героямі якой з'яўляюцца прараб Шайпак і студэнт-практыкант?
*«Новае рэчышча».*

12. Які час у жыцці савецкага народа адлюстроўвае паэма?
Аднаўленне народнай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд.

13. Знайдзіце ў паэме радкі, дзе раскрываецца сэнс яе назвы.
*«Наша рэчышча, што гэта —*
*Не барацьба?*
*Гэта бой, барацьба*
*За святло над сталом...*
*Новым рэчышчам*
*Кіруем жыццём».*

15. Успомніце паэму А. Куляшова, у назве якой словы дэвізу М. Астроўскага. Які эпіграф у гэтай паэмы?
*«Толькі ўперад».*
*«Но вы, друзья, кто там, кто там*
*У дела по своим постам.*
*Вы в одиночку, как и я,*
*В родные ездите края.*
*Наш год, наш возраст самый тот,*
*Что службу главную несёт».*
16. Хто ў паэме і ў сувязі з чым гаворыць:
«Не жадаю я лёгкай
Удачы ў жыцці...
Трэба ўперад ісці,

Толькі ўперад ісці!»?
*Лірычны герой.*
*З прычыны гібелі сваёй каханай.*

17. Чые думкі перадае паэт у паэме словамі:
«Прад вачыма плывуць
як жывыя ізноў
Ўсе сустрэчы мае...
Думаў я, што даўно
спапяліў іх агонь,
А яны б’юць мне ў сэрца,
штурхаюць у скронь.
Мне здавалася, я ўжо
даўно іх забыў,
А я першай любоўю
люблю, як любіў»?
*Юнака.*

18. Хто з тераінь паэмы «вольнай родную бачыць хацела зямлю»?
*Алеся.*

19. Як называецца паэма, у якой раскрыта тэма граніцы і ўз’яднання Заходняй Беларусі ў адзінай Савецкай дзяржаве?
*«Грозная пушча».*

20. Назавіце частку дылогіі «Грозная пушча», якая пачынаецца словамі:
«Папераджаю цярплівых маіх
чытачоў:
Гэта аповесць далёкіх трыццатых гадоў».
*«Стрэчны агонь».*

21. Які сэнс заключаецца ў словах «стрэчны агонь»?
*Словы «стрэчны агонь» маюць двайны сэнс:*
*стрэчным агнём тушылі камсамольцы агонь у лесе,*
*стрэчным агнём сустрэлі ў 1941 г. байцы і партызаны фашысцкіх захопнікаў.*

22. Назавіце галоўных герояў другой часткі паэмы «Грозная пушча».
*Марына, Максім, Цімох, Паліна, Змітрок,*
*Сцяпан і інш.*

23. Аб кім гаворыць аўтар:
«Ведае свет,
аб якім яны мараць пажары...
Хочуць яны, каб дымелі
на людзях шынелі,
Стрэхі на хатах.
Такі ім патрэбен пажар»?
*Аб капіталістах.*

## Крыніцы


1. Бечык, В. Л. Шлях да акіяна : кніга пра паэзію А. Куляшова / В. Л. Бечык. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1981. – 268 с.

2. Бярозкін, Р. Аркадзь Куляшоў: нарыс жыцця і творчасці / Р. Бярозкін. – Мінск : Народная асвета, 1978. – 192 с.

3. Голуб, Т. С. Летапіс жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова / Т. С. Голуб. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – 308 с.

4. Грынчык, М. Аркадзь Куляшоў : крытыка-бібліяграфічны нарыс / М. Грынчык. – Мінск : Беларусь, 1964. – 158 с.

5. Звяровіч, Т. І. А. Куляшоў : Літаратурныя віктарыны / Т. І. Звяровіч – Мінск : Нар. асвета, 1967. – С. 159–171.

6. Кулешов, А. Избранные произведения : в 2 т. / А. Кулешов ; перевод с белорусского. – Москва : Художественная литература, 1968.

7. Куляшова, В. Лясному рэху праўду раскажу… : літаратуразнаўчае эсэ / В. Куляшова. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 335 с.

8. Куляшоў, А. Выбраныя творы / Аркадзь Куляшоў ; уклад., прадм.В. Куляшовай. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 206 с. – (Школьная бібліятэка).

9. Куляшоў, А. Крылы : лірыка 1927-1977 /Аркадзь Куляшоў; прадм.П. Панчанкі. – Мінск : Маст. літ., 1985. – 271 с.

10. Куляшоў, А. Паміж наступным і былым : вершы, паэмы / Аркадзь Куляшоў ; уклад.. і прадм. В. Куляшовай. – Мінск : Маст. літ., 1995. – 542 с., іл. – (Бібліятэка беларускай класікі).

11. Перкін, Н. С. Аркадзь Куляшоў : паэтычная творчасць / Н. С. Перкін. – Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1951. – 203 с.

12. Дзямідава, П. Ёсць у паэта свой аблог : літаратурная вечарына да 100 – годдзя А. Куляшова / П. Дзямідава // Бібліятэка прапануе. – 2013. – № 11. – С. 13–16.

13. Навумчык, М. Вывучэнне балады "Маці" Аркадзя Куляшова / М. Навумчык // Роднае слова. – 2006. – №3. – С.42– 43.

Метадычныя матэрыялы па прапагандзе творчасці

Аркадзя Куляшова да яго 110-годдзя з дня нараджэння

“Аркадзь Куляшоў:

час чытаць, захапляцца і спрачацца”

Складальнік

Галавейка Т. А.

Рэдактар

Легацюк Л. В.

Камп’ютарная вѐрстка  Т. А. Галавейка

Дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме

Кобрынскай цэнтральнай раѐннай бібліятэкі

вул. Маршала Жукава, 12, 225306, г. Кобрын

Цэнтральная раѐнная бібліятэка

E-mail kobrinlib@gmail.com

www.krcls.by